*Юшкевіч К. У.*

# МЕДЫЦЫНСКІЯ АСПЕКТЫ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ Ў ТВОРЫ СВЯТЛАНЫ АЛЕКСІЕВІЧ “ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА”

***Науковы кіраўнік: ст. выкл. Ратынская Н. В.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

27 красавіка 1986 года здарылася адна з самых жудасных трагедый – аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Гэтая падзея набыла сусветны маштаб, але найбольш пакут яна прынесла нашай краіне – Беларусі. На яе тэрыторыі сфарміравалася радыеактыўнае забруджванне навакольнага асяроддзя. З’явіліся тэрыторыі, непрыдатныя для сельскай гаспадаркі, бо радыенукліды накапліваліся перш за ўсё ў глебе і вадзе. Не абышла радыяцыя і чалавека. Вельмі цяжка будзе падлічыць, колькі чалавечых жыццяў забрала гэтая катастрофа. Смяротную дозу радыяцыі атрымалі тыя, хто быў у самым эпіцэнтры падзей, ліквідатары аварыі – пажарныя і працаўнікі станцыі. Моцнаму апраменьванню падверглася вялікая колькасць людзей – звычайных жыхароў найбольш блізкіх гарадоў і весак. Цяжка ўявіць сабе, колькі сямей засталося без бацькі ці маці, колькі калісьці шчаслівых бацькоў страцілі сваіх дзяцей. Нягледзячы на тое, што пасля трагедыі прайшло больш за трыццаць год, беларусы не могуць забыць гэты страшны дзень, бо наступствы аварыі даюць знаць аб сабе і сёння. Пасля катастрофы павялічылася колькасць хвароб эндакрыннай сістэмы, сістэмы крыві, злаякасных новаўтварэнняў.

Такая падзея, як чарнобыльская трагедыя, стала адной з самых актуальных тэм ў беларускай літаратуры. Што як не чулае сэрца пісьменніка можа найлепш перадаць на паперы ўвесь боль і жах ахвяр катастрофы? Беларускія паэты і празаікі ў сваіх творах пачалі асвятляць праблемы духоўнасці, чалавечнасці, любові, шчасця, жыцця і смерці пасля трагедыі. Смела можна сказаць, што чарнобыльская катастрофа адгарнула новую старонку ў беларускай літаратуры.

Дадзеная праца аналізуе твор Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”. Святлана Алексіевіч – пісьменніца, журналістка, сцэнарыст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры. Кнігі пісьменніцы выдаваліся ў дзевятнаццаці краінах свету, у тым ліку ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Японіі, Швецыі, Францыі, Кітаі, В'етнаме, Балгарыі, Індыі. “Чарнобыльская малітва” – адзін з самых вядомых дакументальных твораў, у якім расказваецца пра рэальных людзей – сведкаў і ахвяр катастрофы. Кніга павінна дапамагчы зразумець трагедыю як кожнага чалавека, так і лёсу нашай Бацькаўшчы.



Репозиторий БГМУ